МУЗЫКА



# Арган і яго гаспадыня

**Полацкі арган – адна з унікальных культурных адметнасцяў нашай краіны. Інструмент падобнай велічыні мае толькі сталіца, у іншых гарадах Беларусі невялікія касцёльныя арганы саступаюць нашаму і памерамі, і значнасцю.**

**Полацк – адзіны горад рэспублікі, дзе праводзяцца музычныя арганныя фестывалі. Нездарма на канцэрты сюды прыязджаюць жыхары Мінска, Віцебска і многіх райцэнтраў. Калі ж нехта з вас, шаноўныя чытачы, яшчэ не быў у полацкай Сафіі, давайце завітаем туды хаця б завочна. І папросім гаспадыню аргана Ксенію ПАГАРЭЛУЮ пазнаёміць нас са сваім знакамітым сябрам.**

Л. МАЛАШЭНЯ,
ФОТА С. АНТОНА,
«НС».

З Ксеніяй Максімаўнай мы праходзім па ўрачыста-велічнай зале Сафійскага сабора, адметнага помніка гісторыі і архітэктуры XI–XVIII стст. Па старажытных прыступках узнімаемся амаль на сяміметровую вышыню, дзе ледзь не штодня яны сустракаюцца – арган і арганістка, – каб разам тварыць сваё чароўнае дзейства.

– Арган, – распачынае экскурсію Ксенія Пагарэлая, – быў вынайдзены яшчэ ў III ст. механікам са старажытнай Грэцыі. Тады меў усяго некалькі труб, паветра ў якія падавалася пад ціскам вады, а напампоўвалі трубы рабочыя. Іграць на тым аргане было надзвычай цяжка, клавішы даводзілася прыціскаць кулакамі, лакцямі, тым не менш першаю арганісткаю была жанчына.

Багатыя віртуозныя магчымасці аргана замацавалі за ім славу караля музычных інструментаў. Чым большы арган – тым больш у яго галасоў, тым большым суквеццем фарбаў ззяе яго музычная палітра.

Полацкі арган створаны па індывідуальным праекце майстрамі старэйшай чэшскай фірмы «Рыгер Клос» і ўсталяваны ў Сафійскім саборы ў 1985 годзе. Ён сярэдніх памераў: мае тры клавіятуры і 3905 труб, выкананых з розных парод дрэва і асаблівых металічных сплаваў. Самая вялікая труба дасягае чатырох метраў, а самая маленькая – як сточаны аловак.

Па словах спадарыні Ксені, у нашага аргана досыць шырокі дыяпазон гучання, ёсць свае непаўторныя рэгістры – ягоны голас заўсёды можна адрозніць.

Двух аднолькавых арганаў наогул не бывае. А К. Пагарэлай за 15 гадоў паспяховай канцэртнай дзейнасці даводзілася граць больш чым на трох дзесятках інструментаў. У тым ліку на пяці – фірмы «Рыгер Клос», а ў Дрэздэне – на аргане, які нямецкі майстар Зільберман калісьці будаваў адмыслова для Баха.

Свой арган для Ксені застаецца самым родным. Яна распавядае пра яго з асаблівай пяшчотай:

– Мы сябруем. Я стараюся пра яго клапаціцца. Часам, калі на вуліцы ветрана і мокра, ён можа захварэць і нават ахрыпнуць. Інструмент вельмі хваравіта ставіцца да дрэннага выканання, хаця малапрафесійныя музыканты да нас трапляюць рэдка. Прыходзіш тады – і не пазнаеш яго. Бывае, і майстроў трэба выклікаць.

Рамантавалі полацкі арган двойчы. Апошні раз – спецыялісты швейцарскай фірмы «Маціс», дзе працуюць арганныя майстры ўжо трэцяга пакалення. Сродкі на рамонт збіралі за мяжою. Па просьбе К. Пагарэлай ёй дапамагаў калега Фелікс Пахлатка з Базэля, які аднойчы выступаў у Сафіі і таксама прасякнуўся павагаю да нашага аргана. Спадар Пахлатка наладзіў у Швейцарыі дабрачынны канцэрт, дзе выступала і полацкая салістка.

У Ксені Максімаўны шмат сяброў і дома, і ў замежжы. Калегі і слухачы шануюць яе як высокапрафесійную выканаўцу, пяшчотную маму двух дзяцей, далікатнага і вельмі добразычлівага чалавека. Канцэрты Ксені Пагарэлай надоўга застаюцца ў памяці. Можа таму, што яна надзвычай тонка адчувае аўдыторыю, адмыслова для пэўнай публікі можа мяняць праграму. Нездарма калектыў Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка хадайнічаў аб прысваенні К. Пагарэлай звання народнай артысткі Беларусі.

Ксенія прызнаецца, што не можа граць адчужана, ёй абавязкова трэба ўжыцца ў вобраз, каб і самой атрымаць задавальненне. Да аргана К. Пагарэлая прыйшла праз музыку Баха – складаную, паліфанічную, маладаступную для дзіцячай свядомасці, якую палюбіла яшчэ маленькаю дзяўчынкаю. У шэсць гадоў яна ўгаварыла маму купіць піяніна. Вучылася граць на ім, але ўсё дзяцінства мроіла пра арган. Упершыню пачуўшы яго ў Домскім саборы ў Рызе, васемнаццацігадовая Ксенія засталася верная свайму першаму захапленню на ўсё жыццё. У ліку трох (з дваццаці) студэнтаў курса яна закончыла Маскоўскую кансерваторыю па двух класах – фартэпіяна і аргана. Паехала па размеркаванню ў горад Уладзівасток, дзе так і не дачакалася ўсталявання аргана. Дзеля яго ж прыехала з сям'ёю ў Полацк. Тут з 1987 года яна нязменна саліруе ў Сафійскім саборы, даючы за год да трохсот канцэртаў.

Арган і яго гаспадыня. У непаўторным дуэце гучаць іх душы. Іх сяброўства яшчэ доўга будзе працягвацца на радасць шматлікім слухачам.

---

***Лілія ЕМЯЛЬЯНАВА, загадчыца канцэртнага аддзела Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка:***

– Паглядзець на арган мы дазваляем не ўсім. Але дзяцей і наведнікаў з кветкамі пускаем абавязкова. Усе інструменты ў нейкай ступені жывыя, арган – асаблівы. Ён вельмі тонка адчувае энергетыку. Сустрэўшыся з нядобрым чалавекам, можа нават захварэць ці раптам засваволіць. Чалавеку моцна ўзбуджанаму лепей да яго не падыходзіць. Калі я, напрыклад, спяшаюся, ён можа і не ўключыцца.

Наш арган дысцыплінаваны і заклікае нас быць такімі ж. Яго трэба берагчы і шанаваць. Ён не церпіць мітуслівасці, вакол яго мусяць панаваць годнасць і паважнасць.

Калі садзіцца за арган мінскі маэстра Канстанцін Шараў, то быццам здзяйсняе асаблівы *рытуал, вітаецца з ім, пагладжвае клавішы...*